*Паляшчук Галіна Антольеўна,*

*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*

# Таямніцы мовы

***(Брэйн-рынг)***

## Пазакласнае мерапрыемства для вучняў X-XI класаў

**Мэты:** пашырыць веды вучняў па беларускай мове і літаратуры, стварыць умовы для іх пазнавальнай дзейнасці; развіваць аналітычнае мысленне, выхоўваць пачуццё любові да роднага слова.

**Абсталяванне**: прэзентацыя, канверты з заданнямі.

**Эпіграф:** Мова- гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ (Іван. Мележ).

## Ход мерапрыемства

Гучыць песня “Гаворка беларуская” ў выкананні ансамбля “Бяседа”.

**Вучань**

… Трапяткая яна і цымбальная –
Нібы ў ранішніх травах раса.
Мілагучная, непараўнальная,
як птушыныя песні ў лясах.
Што ні слова – лагодна-гаючае,
Хоць да раны яго прыкладай.
І руплівае, і неўміручае,
І салодкае, як каравай.
З залатымі калоссямі жытнімі
У рамонкава – казачным сне
Наша мова ў дзяцінства спавітая,
Працінае і лашчыць мяне. (Лёля Багдановіч.)

**Настаўнік.** Добры дзень! Сардэчна вітаю вас, шаноўныя ўдзельнікі нашага мерапрыемства! Сёння мы праводзім брэйн-рынг “Таямніцы роднай мовы” для тых, хто пастаянна цікавіцца беларускай мовай і літаратурай, гісторыяй, культурай. У вас ёсць магчымасць паказаць свае веды, эрудыцыю, уменне працаваць у камандзе.

У спаборніцтве ўдзельнічаюць дзве каманды. Гульню будзе ацэньваць журы.

- Як называюцца вашы каманды? Прадстаўце сваіх капітанаў.

## Першы раўнд “Размінка”

Кожнай каманде прапануецца 10 пытанняў з варыянтамі адказаў “так/не”. Кожны правільны адказ прыносіць удзельніку адзін бал.

***Пытанні 1-ай камандзе:***

1. Ці згодны вы з тым, што адзіны прыжыццёвы зборнік М. Багдановіча мае назву “Вянок?” (Так.)
2. Ці можа інфінітыў быць любым членам сказа? (Так.)
3. Ці згодны вы з тым, што ў фальклоры і паэзіі кветкі называюць краскамі? (Так.)
4. Ці праўда, што Якуб колас нарадзіўся ў сям’і настаўніка? (Не.)
5. Ці праўда, што Янку Купалу першаму нададзена званне народнага паэта Беларусі? (Так.)
6. Ці праўда, што ў беларускім алфавіце 31 літара? (Не. 32.)
7. Ці праўда, што ў ліпені 2008 года быў прыняты Закон “Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”? (Так.)
8. Ці праўда, што слова стог заканчваецца літарай х? (Не. Г.)
9. Ці праўда, што паэму “Новая зямля” напісаў Якуб Колас? (Так.)
10. Ці праўда, што канікулы раней называліся вакацыі? (Так.)

***Пытанні 2-ой камандзе:***

1. Ці згодны вы, што ў слове “пясчаны” пішацца літара “ш”? (Не.)
2. Ці згодны вы, што літара “д” пятая па ліку ў алфавіце? (Так.)
3. Ці згодны вы, што “пужлівы” і “палахлівы” – антонімы? (Не.)
4. Ці згодны вы, што па старой меры лічэння 60 штук чаго-небудзь у народзе мела назву “капа”? (Так.)
5. Ці праўда, што сапраўднае прозвішча Янкі Купалы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч? (Не.)
6. Ці праўда, што июнь у перакладзе на беларускую мову – жнівень? (Не.)
7. Ці праўда, што сінонімам да перыфразы “беларускі шоўк” з’яўляецца слова “баравік”? (Так.)
8. Ці праўда, што фразеалагізм “насіць маску” абазначае “вылечваць”? (Не. Прытварацца.)
9. Ці праўда, што самым старажытным горадам лічыцца Полацк? (Так.)
10. Ці праўда, што займеннік увесь прыналежны? (Не. Азначальны)

## Другі раўнд “Што? Дзе? Калі?

*Настаўнік зачытвае пытанні. Адказ дае тая каманда, якая ведае адказ. Гульня працягваецца, пакуль якая-небудзь каманда не набярэ 3 балы.*

1. Закончыце афарызм: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…”. Хто яго аўтар? *(“…каб не ўмёрлі”. Ф.Багушэвіч.)*
2. Пра якую гістарычную асобу ў “Жыціі” гаворыцца:”…як промень сонечны, які асвятліў зямлю Полацкую”? *(Пра Ефрасінню Полацкую.)*

3. У якім творы героі вельмі часта ўжываюць такія ловы:"тудэма-сюдэма" і "вось-цо-да"? Хто яго аўтар? *("Паўлінка". Янка Купала)*
4. Уладзімір Караткевіч у нарысе "Зямля пад белымі крыламі падае тры версіі паходжання назвы "Белая Русь". Адна з іх – вялікая колькасць буслоў, што гняздуюцца на тэрыторыі Беларусі. Назавіце яшчэ дзве версіі пісьменніка. (Белае адзенне беларусаў, "белая", бо не хахоплена была мангола-татарамі.
5. Хто з беларускіх літаратурных герояў пабываў на боскай гары "Парнас"? *(Тарас. Паэма К. Вераніцына "Тарас на Парнасе".)*
6. Паслухайце урывак з апавядання У.Караткевіча "Паром на бурнай рацэ". "Тылу не было. У гэты трывожны жнівень вайна была ўсюды. "Белыя" спрачаліся з "чырвонымі", беларусы не хацелі мірыцца з шавінізмам "белага жонду". Успыхвала, згасала і зноў выбухала абурэнне палітыкай цара". Назавіце год, калі разгортваюцца гэтыя падзеі. *(1863)*
7. Назавіце тры літаратурныя арганізацыі, якія існавалі ў пачатку XX стагоддзя. *("Маладняк", "Узвышша", "Полымя".)*
8. У аповесці Міхася Лынькова "Пра смелага ваяку Мішку" галоўным героем з'яўляецца мядзведзь. А хто ягоныя сябры-жывёлы? (Казёл і сабака.)

**Бліц-пытанне.** Герой вядомай аповесці В.Быкава ад сквапнасці не захацеў падзяліцца са сваімі таварышамі-байцамі тым, што ляжыць у чорнай скрыні. Што гэта? *(Сала.)*

**<u>Трэці раўнд "Скарбы народнай мудрасці"</u>**

*Хто хутчэй і правілна збярэ прыказкі.*

1. не гуляе, справы Гуляй, кідай ды.
2. любіць жыць, у Каб трэба пашане працу.
3. людзі сябе не, пахваляць Сам няхай хвалі.
4. зрабіць, так Не лёгка сказаць як.
5. пачні прапасці – Калі красці хочаш.
6. ходзіць лянівы двойчы плаціць Скупы двойчы.

**Бліц-пытанне .** У скрыні знаходзіцца кніга знакамітага пісьменніка, які падпісваў свае творы па-рознаму: Тамаш Булава, Тарас Гушча і нават Ганна Крум, але мы добра ведаем яго пад іншым псеўданімам. Якім? *(Якуб Колас).*

**<u>Чацвёрты раўнд "Перакладчыкі"</u>**

*Падбярыце рускія адпаведнікі да беларускіх слоў.*

| | |
|---|---|
| Прыступкі – *(ступеньки)* | Абцас – *каблук* |
| Водар – (*аромат)* | Чарот – *(камыш)* |
| Скроні – (*виски)* | Кукішкі – *(корточки)* |
| Ажыны – (*ежевика)* | Трус –*(кролик)* |
| Фіранка – *(занавески)* | Інтэрнат – (*общежитие)* |

**Бліц-пытанне**. Перад вамі на слайдзе вядомае беларускае возера Світязь. Назавіце імя вядомага пісьменніка, аўтара балады, прысвечанай возеру, для якога гэта месца Беларусі з'яўляецца радзімай. (Адам Міцкевіч, Світязь)

**Пяты раўнд “ Фразеалагізмы – залацінкі народнай мудрасці” .**

*Патлумачце фразеалагізмы.*

Падпіраць вуглы –

Валіцца з ног –

Мазоліць вочы –

Мыць языком –

Ставіць на ногі –

Як па масле – добра

Спусціўшы рукавы –

Усплываць на памяць **-**

**Бліц-пытанне.** *Адгадайце беларускія загадкі.*

1. Хоць і красен, ды не дзеўка, хоць з хвастом, ды не мыш. (Буряк.)
2. Насупіцца, нахмурыцца, у слёзы ўдарыцца – нічога не застанецца. (Хмара.)
3. Сядзіцб Пархом на кані вярхом; сам непісьменны, а чытаць дапамагае. (Акуляры.)

**Шосты раўнд “Пазнай партрэт пісьменніка”**

*На экране - партрэты беларускіх пісьменнікаў. Неабходна называць іх імёны або псеўданімы. Калі ўспомніце твор, які належыць пяру названага майстра слова, то атрымаеце дадатковы бал.*

1) Янка Купала;
2) Уладзімір Караткевіч;
3) Якуб Колас;
4) Пімен Панчанка;
5) Максім Багдановіч;
6) Максім Танк.

**Бліц-пытанне.** *Назавіце сапраўдныя імёны і прозвішчы:*

Янкі Купалы (Іван Дамінікавіч Луцэвіч)

Кандрата Крапівы (Кандрат Кандратавіч Атраховіч)

Цёткі (Алаіза Пашкевіч).

**Сёмы раўнд “Прадоўжы твор”**

1. Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, (*скрыпучы, мяккі снег!)*

2. У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: *("Калі ласка!..")*

3. Ніхто з дамашніх не згадае,
Чым рэчка Костуся зваймае,
Якая іх звязала сіла
*І (чым яна так хлопцу міла)*.

4. Падаюць сняжынкі - дыяменты-росы,

Падаюць бялюткі за маім акном...

Расчасала вішня шоўкавыя косы

І *(ўраніла долу снегавы вянок).*

5. Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце.
Маці спаткаеце, -
*(Ёй не кажыце...)*

6. Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
*(Разумею цяпер, чаму з выраю*
*Жураўлі на Палессе ляцяць).*

**Бліц-пытанне.** *Прачытайце наступныя радкі па-беларуску.*
О детства уголок мой милый!
С тобой расстаться я не в силах!
*(Мой родны кут, як ты мне мілы!*
*Цябе забыць не маю сілы!)*

## Восьмы раўнд "Пытанні з капелюша"

1. Прозвішча гэтага беларускага пісьменніка ад назвы саламянага капялюша *(Янка Брыль.)*
2. Свой першы верш "Вясна" Якуб Колас прачытаў бацьку. Якую ўзнагароду атрымаў будучы паэт? (Рубель.)
3. Псеўданім вядомага беларускага паэта, які пераклікаецца з назвай баявой ваеннай машыны. Гэты псеўданім сімвалізуе цвёрдасць, моц, нязломнасць. *(Максім Танк.)*
4. Пра якога беларускага паэта іншы беларускі паэт напісаў: "На ўсю Беларусь мільён пракурораў. І толькі адзін, толькі ён адвакат"? *(Рыгор Семяшкевіч напісаў пра Францішка Багушэвіча".)*
5. Пра якую раку ў "Слове пра паход Ігаравы" сказана, што "…(яе) крывавыя берагі не збожжам былі засеяны зноў – засеяны косцьмі рускіх сыноў"? *(Няміга.)*
6. "Кожную пасудзіну паасобку ён рабіў натхнёна ад пачатку да канца. Майструючы, ён не думаў ні аб чым іншым, як аб сваёй рабоце. Забываў аб ядзе, аб сне. Нікому, апрача жонкі не можна было глядзець, як ён майструе". Прафесія майстра. *(Бондар, Змітрок Бядуля.)*
7. Газета, якая выдавалася ў 1906-1915 г.г. і адыграла выключна важную ролю ў духоўным і культурным адраджэнні беларусаў. *("Наша ніва".)*

8. Гэта кніга пра горад, аб паходжанні якога існуе легенда, увасобленая ў паэме Янкі Купалы. Героі твора – Наталька і Машэка. *(Магілёў. Паэма “Магіла льва”)*

**Бліц-пытанне.**

Дужы ты сваім багаццем,
А я сілы большай,
За мной праўда і народ мой,
За табой жа грошы.

Якому літаратурнаму персанажу належаць гэтыя словы? (Бандароўне.)

*Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцаў.*

**Настаўнік.** Наша мерапрыемства закончылася. І не так важна, хто сёння набраў больш балаў. Галоўнае, што гэты час прайшоў для вас не дарэмна: што ведалі – яшчэ раз успомнілі, чаго не ведалі – даведаліся. А чалавеку трэба шмат чаго ведаць. Трэба ведаць сваю мову і іншыя мовы. Але найперш трэба ведаць сваё, роднае , беларускае, каб з годнасцю можна было сказаць, што вы сапраўдныя беларусы. А нашу сустрэчу хацелася б закончыць на паэтычнай хвалі ўрыўкам з верша Л. Дайнекі “Любіце мову”.

Дрыжыць прастор нябес грамовых,
у родны край ідзе вясна.
Я зноў пра мову, зноў пра мову —
яна, як маці, у нас адна.

Каб белы свет не здаўся вузкім,
каб годна жыць паміж людзей,
Любіце мову беларуску,
Любіце з кожным днём мацней.

У ёй абсяг багроў быленых і поля мудрая душа.
То мова доктара Скарыны, то мова дзеда Талаша.
Яна — жыцця першаснова, яна – стагоддзяў зорны дым.
Калі забудзем, згубім мову, што скажам праўнукам сваім?